Несмотря на все преимущества применение последних достижений ИИ, ключевым недостатком геймификации является то, что этот метод не может охватить все аспекты обучения и требует сочетания с другими подходами. В основе полноценного образования лежит не просто передача знаний (традиционным ли образом или с помощью цифровых образовательных методик), а активное взаимодействие между преподавателем и студентами, а также между самими студентами. Ценность обретенных знаний возрастает многократно, когда они становятся результатом обсуждений, споров и обмена опытом с другими людьми. В такой среде ошибки становятся ступеньками к успеху, исправляемые благодаря поддержке и советам сокурсников и преподавателя, что ведет к глубокому пониманию сути изучаемого материала и развитию навыков решения проблем.

Таким образом, перед современным преподавателем стоит задача комплексного развития: освоение технических навыков для создания интерактивных геймифицированных курсов и развитие педагогических компетенций, необходимых для обучения студентов самостоятельному обучению. Только такой комплексный подход позволит эффективно подготовить будущих специалистов к вызовам цифровой экономики, а также к требованиям реальной жизни, где игровая форма обучения не является универсальным решением.

**Библиографические ссылки**

1. Kapp K. The Gamification of Learning and Instruction: Game-based Methods and Strategies for Training and Education. John Wiley & Sons, 2012. 336 p.

# Гісторыя партызанскага руху ў Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце выхаваўчай работы са студэнтамі

**А. М. Сувалаў**

*Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, кафедра філасофіі і ідэалагічнай работы навукова-педагагічнага факультэта, alehsuv1972@gmail.com*

**Анатацыя:** у артыкуле разглядаюцца краевугольныя моманты гісторыі партызанскга руху Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны, якія могуць быць выкарыстаны пры правядзенні выхаваўчай работы са студэнтамі. Акрэслены праблемныя моманты падрыхтоўкі да партызанскай барацьбы ў даваенны час. Паказаны масштабы партызанскага руху, «рэйкавай вайны» і «партызанскіх зон» ва ўмовах жорскіх карных дзеянняў акупантаў.

**Ключавыя словы:** партызаны; Вялікая Айчынная вайна; рэйкавая вайна; партызанскія зоны; Суражскія вароты.

Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны ў патрыятычным выхаванні маладога пакалення займае адно з цэнтральных месц. Тэма Другой Сусветнай вайны (і Вялікай Айчыннай вайны як складаючага яе этапа), не гледзячы на ўсё большую аддаленасць ад нас па часе, захоўвае вялікі патэнцыял у працэсе патрыятычнага выхавання.

Адна з патрыятычна моцных для выхавання моладзі праблем – партызанскі рух Беларусі. Вызначым найбольш яскравыя аспекты гісторыі партызанскай барацьбы, якія варта выкарыстоўваць пры рабоце са студэнтамі з улікам узроўню падрыхтоўкі сучаных выпускнікоў сярэдніх школ.

З савецкага часу за пасляваеннай Беларуссю замацавалася найменне «рэспубліка-партызанка». Прычына падобнага наймення агульнавядомая: падчас Вялікай Айчыннай вайны партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі быў адным з самых маштабных не толькі на тэрыторыі Савецкага Саюза, але і сярод усіх краін-удзельніц Другой Сусветнай вайны. Пра рэальныя амеры партызанскага руху ў Беларусі кажа той факт, што на пачатак аперацыі «Баграціён» (самая буйная па маштабнах наступальная аперацыя нашай арміі за час Другой Сусветнай вайны, якая праходзіла з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 г., у выніку якой была вызвалена Беларусь) амаль 50 % тэрыторыі рэспублікі знаходзілася пад кантролем савецкіх партызанскіх атрадаў. За час вайны колькасць партызан Беларусі складала каля 374 тыс. чалавек з больш як 1 млн. чалавек усіх партызан СССР. Гэта значыць, што амаль 4 з 10 партызан СССР дзейнічалі на нашай зямлі.

З 30-х гг. XX ст. праводзілася планавая работа па падрыхтоўцы партызанскай барацьбы ва ўмовах магчымай акупацыі тэрыторыі Беларусі. Усяго планавалася падрыхтаваць каля 6 партызанскіх атрадаў з колькасцю ад 300 да 500 чалавек, якія меркаваліся да выкарыстання на тэрыторыі Беларусі пад Барысавам, Бабруйскам, Мазыром, Мінскам, Полацкам і Слуцкам. Атрады кіраваліся штабамі, на чале гэтых атрадаў былі пастаўлены К. П. Арлоўскі, С. А. Ваўпшасаў, В. З. Корж, С. А. Макарэвіч, А. М. Рабцэвіч, А. К. Спрогіс.

Нажаль, падзеі 1937 і наступных гадоў, звязаныя з узмацненнем сталінскіх рэпрэсій, ахапілі і спецыялістаў, падрыхтаваных да выкарыстання ў партызанскай і дыверсійнай барацьбе. Частка з іх была рэпрэсіравана, частка выкарыстана ў якасці спецыялістаў на фронце барацьбы з франкістамі ў Іспаніі. Акрамя кадравых страт праблема

пагаршалася і ў тым, што падрыхтаваныя партызанскія атрады і падпольныя групы былі расфарміраваны, а іх базы зброі і правіянту ліквідаваны. Тым не менш, першымі ў партызанскую барацьбу з ворагам уступілі ацалелыя ў перыяд сталінскіх чыстак кадры, напрыклад такія як будучы партызанскі генерал-маёр В. З. Корж (у 1938 г. ледзве пазбег адказнасці па абвінавачванні ў шпіянажы на карысць Польшчы). У раёне г. Пінска, байцы яго атрада правялі першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны партызанскі бой, які адбыўся 28 чэрвеня 1941 года.

Важна акцэнтаваць увагу на постацях Ц. Бумажкова і Ф. Паўлоўскага (іх атрад дзейнічаў у Гомельскай вобласці), якія 6 жніўня 1941 г. першымі з ліку савецкіх партызан былі ўдастоены высокага звання Герояў Савецкага Саюза.

Заходняя Беларусь на працягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны была ахоплена савецкім партызанскім рухам у меншай ступені, чым іншыя рэгіёны рэспублікі. Прычына крылася ў тым, што Заходняя Беларусь увайшла ў склад БССР (СССР) з восені 1939 г., і частка мясцовага насельніцтва працягвала знаходзіцца пад уплывам ідэй польскага патрыятызму, удзельнічала ў польскім падполлі альбо дзейнічала ў складзе партызанскіх атрадаў Арміі Краёвай («акаўцаў»). Блізкія праблемы былі і ў іншых памежных рэгіёнах Беларусі: на поўдні з украінскімі «бульбаўцамі» і іншымі праўкраінскімі фармаваннямі, на паўночным захадзе з літоўскім «ляснымі братамі», па ўсёй тэрыторыі рэспублікі з беларускімі фармаваннямі самаабароны. Стасункі падобных фарміраванняў з савецкімі партызанамі ў розныя перыяды акупацыі вагаліся ад саюзных (сумесных акцый супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў) да нейтральных, і нават да адкрыта варожых.

Магутным імпульсам для актывізацыі савецкага партызанскага руху становіцца перамога Чырвонай Арміі пад Масквой. Адбываецца структурнае афармленне партызанай барацьбы. 30 мая 1942 г. ствараецца Цэнтральны штаб партызанскага руху, начальнікам якога стаў першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка. Гэтае прызначэнне было сведчаннем заслуг партызан Беларусі ва ўсенароднай барацьбе народаў Савецкага Саюза з акупантамі. Менавіта П. К. Панамарэнка быў адным з галоўных распрацоўшчыкаў і кіраўнікоў правядзення аперацыі «рэйкавая вайна», якая мела магутны эфект у зрыве нармальнай працы чыгуначных камунікацый праціўніка. Вядома, што за гады вайны партызаны СССР пусцілі пад адхон каля 18.000 эшалонаў, 11.128 з іх на рахунку партызан Беларусі (больш за 60 % ад ліку падарваных эшэлонаў усімі партызанамі

Савецкага Саюза: Расіі (РСФСР), Украіны (УССР), Літвы (Літоўскай ССР), Латвіі (Латышскай ССР) і Эстоніі (Эстонскай ССР)).

Адмысловае значэнне маюць знакамітыя «Суражскія вароты» (другая назва «Віцебскія вароты»). Яны ўяўлялі сабой 40 км разрыву ў нямецкім фронце ў раёне г. Сураж пад Віцебскам паміж флангамі груп армій «Поўнач» і «Цэнтр», які ўтварыўся з прычыны наступлення Чырвонай Арміі пад Масквой і дзеянняў партызан Беларусі. «Суражскія вароты» існавалі з лютага па верасень 1942 г., яны падтрымліваліся з аднаго боку Чырвонай Арміяй, а з другога партызанамі. Праз іх у тыл Чырвонай Арміі выйшла 35 тыс. чалавек мірных жыхароў, акружэнцаў і параненых партызан, адпраўлена ў тыл вялікая колькасць харчавання з Беларусі, а на часова акупаваную тэрыторыю перапраўляліся групы дыверсантаў, цэлыя партызанскія атрады, дастаўлялася стралковая зброя, узрыўчатка, сродкі сувязі і медыкаменты.

Рост эфектыўнасці партызанскай барацьбы знаходзіўся ва ўзаемасувязі з карнымі дзеяннямі акупантаў. Сумная статыстыка сведчыць, што 628 вёсак Беларусі былі спалены карнікамі. 186 вёсак больш ніколі не былі адноўлены, астатнія вёскі, якія перажылі трагедыю Хатыні, былі пасля вайны зноўку адбудаваны і адноўлены. Вядома, што Хатынь (як і многія іншыя вёскі і вёскі Беларусі) была спалена разам з жыхарамі ў якасці помсты партызанам за іх актыўную барацьбу з ворагам. Аднак рэпрэсіі і карныя акцыі акупацыйных уладаў у дачыненні перш за ўсё мірнага насельніцтва прыводзілі да зваротнага эфекту ‒ масавай падтрымцы партызанскага руху.

На паўднёвым усходзе Беларусі, у выніку актыўных дзеянняў партызанаў «гарнізона Ф. І. Паўлоўскага» ў Кастрычніцкім раёне Гомельскай вобласці, а таксама партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі пад Клічавым, былі ліквідаваны даволі буйныя нямецкія гарнізоны ў гэтых мясцовасцях. Метавіта тут адбываецца фарміраванне першых партызанскіх зон, у межах якіх аднаўлялася савецкая ўлада.

Партызанамі праводзяцца буйныя ваенныя і дыверсійныя аперацыі. Змяняюцца формы партызанскай барацьбы: акрамя разведкі і дыверсій партызаны Беларусі ўпершыню ў сусветнай гісторыі пачынаюць выкарыстоўваць неўласцівыя для неармейскіх фарміраванняў формы супрацьдзеяння праціўніку ў выглядзе пазіцыйнай вайны, вызвалення і ўтрымання пад сваім кантролем часткі тэрыторый (знакамітыя партызнскія зоны). На канец 1942 – пачатак 1943 г. у Беларусі партызанскія атрады аб’ядноўваюцца ў брыгады і злучэнні. Падобныя масавыя фарміраванні дазвалялі праводзіць больш маштабныя, чым раней партызанскія аперацыі,

ствараць і ўтрымліваць пад сваім кантролем цэлыя партызанскія зоны, якіх у Беларусі было больш за дваццаць (напрыклад, Полацка-Лепельская, Барысаўска-Бягомльская, Кастрычніцка-Любанская, Слуцка-Копыльская). Расонска-Асвейская, Клічаўская, Івянецка-Налібоцкая і г. д.).

Мужнасць і адвага партызан Беларусі былі высока ацэнены. 87 партызан і падпольшчыкаў былі ўдастоены звання Герояў Савецкага Саюза, каля 130 тыс. узнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Моцнае выхаваўчае ўздзеянне павінны аказаць прыклады подзвігаў маладых партызан і падпольшчыкаў, напрыклад М. Казея, З. Партновай і Б. Царыкава. Выкарыстанне ўказаных гістарычных матэрыялаў значна павысіць узровень патрыятычнага выхавання маладога пакалення.

## Китайский опыт цифровизации высшего образования в Харбинском педагогическом университете

**Сюй Цзявэнь**

*Белорусский государственный университет,*
*факультет философии и социальных наук,*
*кафедра философии и методологии науки, xjwhybd@outlook.com*
*Научный руководитель – доцент В. В. Анохина*

**Аннотация.** В данной статье анализируется опыт внедрения цифровых технологий и дистанционного образования в Харбинском педагогическом университете. Автором рассматриваются инновационные тренды развития высшего гуманитарного образования в Китае в условиях цифровой трансформации страны. Описываются новые методы дистанционного преподавания и мультимедийные средства обучения, которые успешно применялись в вузах КНР в условиях пандемии. Цифровизация высшего гуманитарного образования рассматривается в контексте развития информационных технологий современного китайского общества, что соответствует общегосударственной задаче построения цифрового Китая. Обобщаются национальные достижения в области развития новейших технологий высшего образования, обсуждаются основные стратегии цифровизации, примененные Харбинским университетом в период пандемии COVID-19, а также выделяются и оцениваются преимущества и недостатки дистанционного образования, в том числе с точки зрения студентов.

**Ключевые слова:** цифровизация образования; дистанционное образование; Харбинский педагогический университет; высшее образование в Китае; «цифровой Китай»; программа «Интернет + образование».

В контексте современного этапа модернизации китайского общества вопросы цифровизации науки и высшего образования рассматриваются в стране как приоритетные направления развития. Согласно исследованиям,